Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Каменскі вучэбна – педагагічны
комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа»



# Гістарычны музей «Бацькаўшчына»



**аг. Камень, 2021 г.**

# Адкуль у вескі імя

…Тутэйшыя людзі лічаць: вёска Камень завецца так не таму, што вакол яе некалі «раслі» камяні. Імя сваё яна атрымала ад валуна – волата (яго называюць «возам»), паблізу ад якога і пачала будавацца…



Здарылася гэта ў даўніну, пра якую ўжо і дзяды не памятаюць. Вёз неяк селянін воз сена з пушчы. Конік быў нягеглы, слабы і ў час пад'ёму на гару зусім выбіўся з сіл. Колькі ні паганяў яго гаспадар – ні з месца. Пачаў пугай хвастаць, ды яшчэ праклінаць – прыгаварваць: «А, каб ты, воўчы недаедак, у камень ператварыўся!». Паднатужыўся конік, усцягнуў такі воз на гару і зноў прыстаў. Мужык хвошча яго пугай, паганяе, а конік стаіць, унурыўшы галаву, і анічога ўжо не чуе і не адчувае. Азірнуўся мужык паглядзець, як там воз, ці трымаецца, і аслупянеў ад здзіўлення і страху: няма воза, а замест яго ляжыць шэры, велічынёй з воз, камень. Кінуўся мужык каня распрэгчы, толькі за хамут узяўся, ажно позна – ляжыць паміж аглабель цёмна-шэры, такой жа, як у ягонага коніка, масці, камень…



# Інфармацыя аб населеным пункце





Аграгарадок Камень размешчаны ў Грозаўскім сельскім савеце, у 28 км на паўночны-ўсход ад Капыля, у 86 км на поўдзень ад Мінска. Упершыню Камень згадваецца ў XVI ст. як сяло ў складзе маёнтка Грэск у Навагрудскім павеце і ваяводстве Вялікага Княства Літоўскага.

У вёсцы Труханавічы (2 км ад аг. Камень) 3 лістапада 1905 г. нарадзіўся беларускі пісьменнік Ян Скрыган.

У Вялікую Айчынную вайну з 27.06.1941 г. да 01.07.1944 г. вёска была акупаваная нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На фронце і ў партызанскай барацьбе загінула 206 жыхароў.



У аграгарадку працуе «Каменскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа», фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, аддзяленне сувязі.

# Гістарычны музей «Бацькаўшчына»

Музей «Бацькаўшчына» заснаваны 23 верасня 2013 года і з'яўляецца цэнтрам грамадзянска-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення. У музеі сабрана вялікая колькасць экспанатаў




і фатаграфій (усяго больш за 600), якія ляжаць у аснове 4-х экспазіцый. Фонды музея





папаўняюцца дзякуючы навучэнцам і іх бацькам, настаўнікам, мясцовым жыхарам.

Найбольш каштоўнымі



з'яўляюцца: бязмен, посцілка тканая, Ганаровая Грамата Вярхоўнага Савета БССР Скрыгну І.А., кій, лямпа настольная Яна Скрыгана, стул пісьменніка, прагулачная камізэлька, акуляры, будзільнік у футляры, партрэт Яна Скрыгана, запалкавая пушка, выдадзеная ў 1961г, настольныя ціскі.

# Адукацыйная дзейнасць музея

Музей «Бацькаўшчына» праводзіць экскурсіі на трох маршрутах, па пяці тэмах:

**1. "Ты хочаш міру? Помні пра вайну!»**

Тэмы экскурсій на маршруце: «Вялікая вайна – вялікі подзвіг народа», «Ён быў такі, як ты...».

**2. «Ян Скрыган: вяртанне на радзіму»**

Тэмы экскурсій на маршруце: «Тры жыцці Свята-Петрапаўлаўскай царквы», «Ян Скрыган – наш славуты зямляк».

**3. «Руіны сядзіб Наркевічаў-Ёдкаў: Сунаі і Лапухі».**

Тэма экскурсіі на маршруце: «Так жылі нашы продкі».





Наведвальнікам музея прапануюцца: выставы («Карагод з кветак», «Народныя ўмельцы»), музейныя ўрокі («Гісторыя аднаго экспаната, «Там дзе лён сінявокі расце», «У свеце рэчаў і часоў», «Вясновыя святы беларусаў», «Беларускія рамёствы», «Незабытыя героі неаб'яўленай вайны», «Дзякуй салдатам Перамогі за тое, што не ведаем вайны»), урокі мужнасці, урокі памяці, святы («Купалле», «Масленіца», «Гуканне вясны», «Багач», «Каляды»), гульнёвыя праграмы («Сустрэча з казкай", "Беларускія гаспадынькі», «Калядныя варожбы») і іншыя.



На базе музея праводзяцца семінары, метадычнае аб'яднанне кіраўнікоў музеяў устаноў адукацыі, класных кіраўнікоў.



Сардэчна запрашаем!





Наведвальнікам музея прапануюцца выхаваўчыя мерапрыемствы і сустрэчы са знакамітымі землякамі «Ен быў такі, як ты...», «Афганістан: наша памяць і боль», «Званы Чарнобыля», «Плацдарм бессмертия», «Сыновья уходят в бой».












# Выхаваўчая дзейнасць музея





Навучэнцы школы рэгулярна бываюць на экскурсіях у музеях і мемарыяльных комплексах: «Народны музей гісторыі ДТСААФ», «Музей гісторыі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны», «Курган Славы», «Лінія Сталіна», «Хатынь», «Па месцах партызанскай славы Капыльшчыны», «Спаленыя вёскі Капыльшчыны».










Сардэчна запрашаем!







Асобая ўвага надзяляецца пошукавай і даследчай рабоце навучэнцаў. Праведзены даследванні «Памятаць, нельга забыць», «Дзяцінства, апаленае вайной», «Воинское захоронение в деревне Осовец Копыльского района», «Зоркі на абелісках», «Партызанскі атрад імя 26 гадоў Кастрычніка 225–й брыгады імя А. Суворава», «Адкуль у вёскі імя?», «Свята-Петрапаўлаўская царква вескі Труханавічы і яе роля ў адукацыі і выхаванні насельніцтва», «Усадебно-парковый комплекс «Лопухи»», «Технология деревянного строительства в конце XIX века на востоке Копыльского района», «Ян Скрыган: вяртанне на радзіму», «Творчыя сляды дзядулі Скрыгана».

Вынікі даследчых работ навучэнцаў установы адукацыі знайшлі месца ў экспазіцыі музея. Працуе выстава «Мы памятаем! Мы ганарымся!», якая знаёміць з воінамі–землякамі, якія абаранялі родную зямлю ў гады Вялікай Айчыннай вайны.








# Грамадска карысная дзейнасць музея









Акцыі па добраўпарадкаванні месцаў воінскіх пахаванняў праходзяць рэгулярна. На працягу года вучнямі і работнікамі ўстановы адукацыі праводзіцца прыбіранне і падкошванне тэрыторыі, фарбаванне агароджаў.

Падчас экспедыцыі па збору экспанатаў і матэрыялаў, сустрэч з мясцовымі жыхарамі ўдалося даведацца пра лёс нашых землякоў, подзвігі абаронцаў Айчыны, перагарнуць ваенныя старонкі ў гісторыі населеных пунктаў нашай мясцовасці. Сабраны ўспаміны пра вайну мясцовых жыхароў, афармлены альбом.

Установа адукацыі падтрымлівае сувязь з роднымі Яна Скрыгана - яго дачкой Галінай Іванаўнаў Скрыган і старэйшым ўнукам Юрыем, якія штогод наведваюць нашу школу, перадаюць каштоўныя экспанаты для музея і шмат цікавага расказваюць пра свайго бацьку і дзядулю.

На вечарынах, прысвечаных пісьменніку, выступаюць Хрысціна Лялько, Сяргей Панізнік, Кастусь Цвірка, Анатоль Бутэвіч, Галіна Дзягілева і іншыя.

Школа наладзіла ўстойлівыя сувязі з Нацыянальнай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь.

# ЯН СКРЫГАН

# Экспазіцыя «Ян Скрыган – наш славуты зямляк»




Чырвонаю ніткаю ў экспазіцыі праходзіць раздзел пра жыццёвы і творчы шлях нашага земляка Яна Скрыгана. Асобым гонарам з'яўляюцца фотаздымкі, кнігі і асабістыя рэчы вядомага беларускага пісьменніка, паэта, крытыка, нарысіста, навеліста, публіцыста.

Першая сустрэча, з якой пачалося сяброўства з дачкой Яна Скрыгана Галінай Іванаўнай, адбылася ў лістападзе 2010 года ў Доме літаратараў, дзе праходзіла святкаванне 105-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. На гэта мерапрыемства былі запрошаны прадстаўнікі нашай установы адукацыі. Пры асабістай сустрэчы дырэктара школы Васілевіч Галіны Мікалаеўны і Галіны Іванаўны Скрыган у школьны музей былі перададзены кнігі пісьменніка Яна Скрыгана.









**Сардэчна запрашаем!**

# Экспазіцыя «Ян Скрыган – наш славуты зямляк»



Адкрыццё экспазіцыі адбылося 11 лістапада 2011года.
У час экскурсіі наведвальнікі знаёмяцца са складанымі старонкамі жыцця пісьменніка Яна Скрыгана, могуць ацаніць яго вялікі ўклад у беларускую літаратуру. На стэндах размешчаны ўнікальныя гістарычныя фотаздымкі: Ян Скрыган з першай жонкай Галінай (1936г.), на этапе (канец 30-х гадоў), першы з’езд літаратурнага аб’яднання «Маладняк», «пільнае вока» Скрыгана.











# Экспазіцыя «Ян Скрыган – наш славуты зямляк»




«Найлепшай біяграфіяй у пісьменніка з’яўляюцца яго кнігі. Бадай, што ўсё, зробленае мною, гэта нейкая частачка самога сябе» – так пісаў у сваім дзённіку Ян Скрыган. Беларуская пісьменніца, галоўны рэдактар часопіса «Наша Вера» Хрысціна Лялько перадала ў музей двухтомнік, на якім сам Іван Аляксеевіч зрабіў памятны надпіс.

Важнае месца займаюць асабістыя рэчы пісьменніка: тканыя гальштукі, пояс, акуляры, пенал з






ручкамі, будзільнік у футляры, настольная лямпа, камізэлька, а таксама кіёчкі, зробленыя рукамі Скрыгана.

У час правядзення экскурсій у школьным музеі паказваецца, як аддана і шчыра Ян Скрыган любіў сваю бацькаўшчыну, да апошняй хвіліны свайго жыцця яго хваляваў лёс нашай роднай беларускай мовы. Нам, сучасным беларусам, неабходна гэтаму сёння павучыцца.


1941
1945

# Экспазіцыя «Вайна вачыма землякоў»

Мірнае мінулае нашай мясцовасці, як і краіны ў цэлым, цесна пераплятаецца з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. У раздзеле музейнай экспазіцыі «Вайна вачыма землякоў», прысвечанай гэтаму перыяду, нямала рэдкіх фотаздымкаў і дакументаў, якія, безумоўна, выклікаюць цікавасць у наведвальнікаў.




Усе жахі вайны на свае вочы ўбачыў наш зямляк Пыжык Гаўрыіл Кліменцьевіч. Для яго вайна пачалася ў далёкім 1939 годзе, а скончыў ен свой ваенны паход у Берліне. На






Гвардии [illegible]

Вам, участнику Вел[illegible] Отечественной войны против немецких захват[illegible]ков, за отличные боевые действия, приказами [illegible]рховного Главнокомандующего Маршала Сов[illegible]ского Союза товарища Сталина об'явлены благодарности:

1. За освобождение [illegible]рода Борисов 1 июля 1944 года.
2. За освобождение [illegible]лицы советской Белоруссии города Ми[illegible] 3 июля 1944 года.
3. За освобождение [illegible]лицы советской Литвы города Вильнюс 13 [illegible]юля 1944 года.
4. За взятие городов [illegible]енцлау и Ангермюнде 27 апреля 1945 год[illegible]
5. За взятие городов [illegible], Фриланд, Ной[illegible] [illegible] апреля 1945 года.
6. За взятие городо[illegible] Штральзунд, Гриммен, Деммин, Мальхин Варен, [illegible] 1 мая 1945 года.
7. За взятие городо[illegible] Росток, Варнемюнде — крупных портов и [illegible]ажных военно-морских баз на побережье [illegible]алтийского моря 2 мая 1945 года.
8. За взятие городов [illegible]арт, Бад Доберан, Нойбуков, Варин, Витенберг и соединение с союзными нам английскими войсками 3 мая 1945 года.

[illegible] части [illegible]

стэндзе размешчаны фотаздымкі, узнагароды і сшытак з успамінамі ветэрана. Матэрыялы, якія змешчаны ў «Музеі ў чамадане», дазваляюць праводзіць урокі мужнасці, урокі памяці, наведваць выязныя выставы і знаёміць з сапраўдным салдатам Перамогі – Пыжыкам Гаўрыілам Кліменцьевічам.



Сардэчна запрашаем!




Экспазіцыю нядаўна папоўніў матэрыял пра земляка, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны – Дашукевіча Васіля Кірылавіча. У час вайны ён быў наводчыкам артылерыйскай гарматы, у баях за родную Беларусь быў цяжка паранены. Ваенны шлях кавалера ордэна Айчыннай вайны 1 ступені служыць прыкладам мужнасці і адвагі.


ПРАВДА

Обращение тов. И. В. Сталина к народу

Каштоўны экспанат музея – газета «Праўда» ад 10 мая 1945 года – выклікае асаблівую цікаўнасць наведвальнікаў музея.

# Экспазіцыя «Вайна вачыма землякоў»

У музеі адкрыта выстава «Мы памятаем! Мы ганарымся!», якая знаёміць з землякамі, імёны якіх былі ўстаноўлены і знойдзены месцы іх пахавання ці ўдзелу ў ваенных дзеяннях у ходзе даследчай работы школьнікаў і настаўнікаў.




Памяць пра загінуўшых нашых землякоў свята захоўваецца нашым народам. Узбагачаюць экспазіцыю фотаздымкі 42 воінаў–землякоў, якія загінулі ў час вайны.



Другая частка гэтага раздзела прысвечана выпускнікам школы, якія выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане. Фотаздымкі і дакументы сведчаць пра цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на лёс нашых землякоў у 80–я гады.


Здравствуйте дорогие родные
мама, папа и бабушка. С горя-
чим приветом к вам Ваник.
Во-первых своих строчках пись-
ма хочу сообщить, что я
жив и здоров. Вот сегодня
выписываюся из госпиталя, не
хотел вас пугать так и
не писал что лежу в госпи-
тале. Приехал проходить
медицинскую комиссию и
поднялось у меня давле-
ние до 165 на 95 меня
положили на обследова-
ния, вот целую неделю
лежал, всех врачей по но-
вому проходил, всего обсле-

# Сардэчна запрашаем!


ЭТНА

# Экспазіцыя «Этнаграфічны матэрыял нашай мясцовасці»



Этнаграфічны раздзел музейнай экспазіцыі адлюстроўвае быт і культуру вяскоўцаў першай паловы XX стагоддзя. Тут сабраны дарагія сэрцу рэчы, якія некалі былі неад’емнай часткай жыцця кожнай сялянскай сям’і: разнастайныя прылады працы, посуд, тканыя вырабы. Імі карысталіся нашы бабулі і дзядулі, прабабулі і прадзядулі.



Элементам асноўнай мэблі ў сялянскай хаце быў куфар. Колькасцю куфараў вымяраўся дастатак гаспадароў. У іх захоўвалі адзенне, упрыгожванні, палатно, тканыя вырабы. Ён служыў абавязковай часткай пасагу маладой.



Паўсядзённае жыццё пачыналася з працы. Раней усе прадметы штодзённай неабходнасці выраблялiся сваімі рукамі. Першым абавязкам жанчыны пасля прыгатавання ежы было абшыць усю сям’ю. Адзенне насілі даматканае – ільняное або шарсцяное.Каб пашыць адзенне, трэба было спачатку напрасці нітак. Да такой работы прыступалі ўвосень, пасля заканчэння ўборкі ўраджаю, стараліся закончыць да пачатку вясны, пачатку веснавых работ.



**Сардэчна запрашаем!**

# Экспазіцыя «Этнаграфічны матэрыял нашай мясцовасці»



Цэнтральнае месца ў хаце займаюць кросны, прылады для апрацоўкі льну, прадзення нітак. Для таго, каб саткаць за шэсць месяцаў тры сувоі па 50 метраў даўжынёй, трэба было праводзіць за кроснамі па 12–15 гадзін у дзень.

Экспазіцыя падрабязна знаёміць з прыладамі для апрацоўкі льну і прасочвае шлях ільнянога снапа да ніткі. На свае вочы можна ўбачыць пранік для абівання галовак ільну, трапло-прыладу для трапання валакна, церніцу, якая дапамагае змінаць лён, грэбень для часання валакна, прасніцу для прадзення нітак і іншыя. Цікавым экспанатам з’яўляецца ткацкі хатні станок – кросны, які займаў важнае месца ў сялянскай хаце і быў выраблены ў нашай мясцовасці. Ткацкія вырабы: посцілка, абрус, ручнікі, спадніца, сурвэткі – пазнаёмяць з дзіўнымі творамі колішніх ткачых.





Для прасавання выкарыстоўвалі вугальны прас, а таксама сухую бялізну ці адзенне, наматвалі на роўна абструганую палку і пачыналі качаць па стале прамавугольным тоўстым, з кароткай ручкай, рублём.

# Экспазіцыя «Этнаграфічны матэрыял нашай мясцовасці»



Лапці – асноўны абутак у будні і святы. Гэты плецены абутак з ліпавага лыка. Лапці мацаваліся да нагі пры дапамозе завязак.. Зімой лапці праношваліся за 10 дзён, пасля пацяплення – за 4, летам, у гарачую пару – за 3.

Плеценымі вырабамі продкі карысталіся з даўніх часоў. Гэта ёмістасці для збору ягад, грыбоў, агародніны і садавіны, пераносу і захоўвання розных прыпасаў. Вырабляліся з пласта кары – лубу, плеценыя з кары, корня, галін, саломы. Яны розней формы: авальныя, квадратныя, прамавугольныя, з крышкамі і без крышак.



Бондарскія вырабы – бочкі, дзежкі, блінцоўкі, ступа, рэшаты, каробкі. Ганчарныя вырабы – збанкі, гладышы, гляк, гаршкі. Цікавымі экспанатамі з’яўляюцца бязмен, калатоўка.Бязмен выкарыстоўваўся для ўзважвання прадуктаў. Дата вырабу экспаната – 1909 г. Калатоўка – прылада, вырабленая з верхавіны елкі, дапамагала размінаць шматкі агародніны ў пюрэ.

Многія этнаграфічныя прадметы выкарыстоўваліся ў абрадах.

Музейныя заняткі, тэматычныя экскурсіі этнаграфічнай накіраванасці выклікаюць захопленасць дзяцей работай, іх цікавасць і жаданне займацца фальклорам, прыкладным мастацтвам.

**Сардэчна запрашаем!**


ШКОЛА

# Экспазіцыя «Гісторыя школы»








Экспазіцыя «Гісторыя школы» створана апошняй. Дзякуючы дапамозе педагогаў і выпускнікоў, у музеі былі сабраныя каштоўныя экспанаты. У гэтым раздзеле экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы, архіўныя дакументы і фатаграфіі аб педагогах і выпускніках школы. З рэчавых крыніц-школьная парта, узнагароды навучэнцаў, школьная форма, піянерскі гальштук, значкі (акцябрацкія, піянерскія, камсамольскія і інш.), школьныя прыналежнасці, падручнікі, кнігі, альбомы з фотаздымкамі.

Вялікую цікавасць уяўляюць матэрыялы па гісторыі дзіцяча-юнацкага руху, аб дзейнасці піянерскай і камсамольскай арганізацыі.



# Іншыя турыстычныя аб'екты



**1.** Месца бою партызанскіх атрадаў 7 лістапада 1942 года



**3.** Лапухі. Рэшткі сядзібы Наркевічаў-Ёдкаў

г. Узда, 31 км

г. Несвиж, 45 км

г. Копыль, 16 км

г. Копыль, 14 км






**2.** Месца бою батарэі 287-га артылерыйскага палка. 3-4 чэрвеня 1941 года



**4.** Рэшткі царквы ў імя святога Георгія



**5.** Музей «Спадчына». ДУА «Камсамольскі ВПК дз/с - СШ»

**13.** Рэшткі сядзібы рода Мержэеўскіх





**6.** Курганны могільнік. 44 насыпы



**7.** Сунаі. Рэшткі сядзібы Наркевічаў-Ёдкаў




г. Мінск, 86 км

г. Слуцк, 19 км

**8.** Сядзіба Яна Скрыгана





**9.** Магільны курган з каменным крыжам



**10.** Агра-сядзіба «Вяселая хата»



**12.** Палац Мержэеўскіх



**11.** Сядзіба «Канюхі». Месца службы Г.К. Жукава



Сардэчна запрашаем!

**1. Аграгарадок Старыца.**

На тэрыторыі вёскі адбылося два баі. Першы - 3-4 ліпеня 1941 года. Фашысты не разлічвалі на тое, што ў гэтай вёсцы хтосьці акажа супраціў. Але да Старыцы выйшлі чырвонаармейцы. Разгарэўся бой. Батарэі 287-га артылерыйскага палка пад камандаваннем Івана Усцінава ўдалося вырвацца. Астатнім не пашанцавала. 180 воінаў і іх камандзіры аддалі сваё жыццё за Радзіму.

**2. Другі бой** разгарэўся 7 лістапада 1942 года. Людзі вырашылі адзначыць 25-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Старыцкім лесе. Тут сабралася некалькі партызанскіх атрадаў. Хтосьці далажыў немцам. Гітлераўцы кінулі вялікія сілы, каб ліквідаваць партызан і мірнае насельніцтва. У гэтым баі загінула велізарная колькасць фашыстаў і, што самае сумнае, нашых землякоў.

**3. Вёска Дунаева. Рэшткі сядзібна-паркавага комплексу «Лапухі».** У 1846 годзе сядзібу купляе Адам Вайніловіч і пасля перадае яго сыну Эдварду. Ва ўласнасці Вайніловіча сядзіба знаходзілася да У 1903 года. Калі памерлі яго дзеці - спачатку сын Сімяон, затым Дачка Алёна - Эдвард прадаў сядзібу Наркевічам-Ёдкам, а ўсе атрыманыя грошы ўклаў у будаўніцтва аднаго з самых вядомых і сімвалічных помнікаў архітэктуры Беларусі - Мінскага касцёла святых Сымона і Алены. З будынкаў сядзібы захаваўся адзін свіран, пабудаваны ў 1872 г. На тэрыторыі комплексу можна ўбачыць рэшткі двух квадратных калодзежаў, будынкаў, у якіх даволі добра захаваліся сцены, невялікага круглага фантана, два вадаёма і рэшткі падмурка сядзібнага дома.

**4. Вёска Камсамольская.** У 1857 годзе пабудаваны прасторны каменны храм ва ўнікальным спалучэнні стыляў: класіцызму, рэтраспектыўна-рускага і нават дзесьці неаготыкі. Другі падобны храм у Беларусі знайсці складана! Асвячалася царква ў імя святога Георгія. На бакавых фасадах чаргаваліся дэкаратыўныя калоны і вокны. Над гонтавым дахам асноўнай залы ўзвышаўся купал на гранёным барабане, а над трох'яруснай званіцай - невялікая макаўка з крыжам. Унутры царквы знаходзіўся аднаярусны белы з пазалотай іканастас на 33 абразы.



**5. ДУА «Камсамольскі ВПК дзіцячы сад - сярэдняя школа». Музей «Спадчына».** Раздзелы экспазіцыі: «Архітэктурна-гістарычная спадчына», «Свет памятае і сёння...», «Сялянскі побыт XX стагоддзя», «Нашы слаўныя землякі».

**6. Вёска Кісялі. Курганны могільнік.** 44 паўсферычныя насыпы вышынёй да 1,8 м, дыяметрам 5-12 м. Раскопкі не праводзіліся.

**7. Вёска Сунаі. Рэшткі сядзібна-паркавага комплексу.** Будаўніцтва сядзібы пачаў у 1846 годзе Томаш Наркевіч-Ёдка. У першую чаргу быў пабудаваны дом, да якога прылягалі з аднаго боку пейзажны парк, а з другога - вялікі фруктовы сад. Парк сядзібы быў акружаны вялікай каменнай агароджай з палявых валуноў, а таксама маляўнічай воднай сістэмай. Праз парк у сядзібу вяла ўязная алея, у якой было пабудавана неагатычных формаў будаванне - двухпавярховы паркавы домік-альтанка. У цэнтры парку знаходзілася сядзібная аранжарэя. У 1850 годзе было пабудавана грандыёзнае для свайго часу гумно плошчай 1600 квадратных метраў. Стайня была пабудавана некалькі пазней астатніх будынкаў - у 1858 годзе. Дзівяць сваёй велічынёй і разгалінаванасцю падземныя камеры для захоўвання гародніны і садавіны.

8. **Вёска Труханавічы** - месца, дзе нарадзіўся Ян Скрыган. З пачуццём вялікай любові ён успамінаў родныя мясціны ў сваіх аўтабіяграфічных творах «Кругі». У Труханавічах прайшло дзяцінства і гады вучобы ў царкоўна-прыходскай школе, што размяшчалася паблізу дома. Сёння дом не захаваўся. Але ў музеі «Бацькаўшчына» ёсць яго макет, выкананы па арыгінальным чарцяжах.

**9. Вёска Асавец.** На ўскраіне лесу насыпаны магільны **курган з каменным крыжам** на вяршыні. Вышыня кургана 2 м, дыяметр 12 м.

**10. Вёска Калюга. Аграсядзіба «Вясёлая Хата».** На тэрыторыі ў 2 га размяшчаецца два дамы. Да паслуг гасцей ёсць усё неабходнае для камфортнага адпачынку. Для паслаблення ёсць дзве лазні на дровах, на другім паверсе лазні размяшчаецца сенавал. На тэрыторыі ёсць уласнае возера, дзе можна купацца і рыбачыць. Асаблівым гонарам з'яўляецца Эка-ферма. Таксама ў сядзібе маецца свой уласны музей старадаўняга беларускага побыту. Гэта інтэрактыўны музей, дзе можна паглядзець і самім паспрабаваць змалоць муку, сатканць ручнік. Для гасцей арганізуюцца конныя прагулкі.У сядзібе праводзяцца старадаўнія беларускія абрады. Гасцям прапануецца экалагічнае, высакаякаснае харчаванне з «чыстых» прадуктаў, вырашчаных на ўласным падворку. Стравы рыхтуюцца ў беларускай печы па старажытных рэцэптах.



**11. Сядзіба «Канюхі»** была яна пабудавана ў 1900 годзе. Складалася з сядзібнага дома, піваварнага завода, свірна з лядоўняй, парку і вадаёма. Сядзібны дом быў каменным, двухпавярховым з відавой вежай і масіўным чатырохкалонным порцікам. Да 30-х гадоў XX стагоддзя там размяшчаўся Дом адпачынку для герояў грамадзянскай вайны. Сюды прыязджалі Будзённы, Варашылаў, Убарэвіча і Жукоў. Сёння з пералічанага захаваўся толькі сядзібны дом. З 1927 года на тэрыторыі сядзібы размясціўся 4-ы асобны кавалерыйскі эскадрон 4-ой стралковай дывізіі, якой з 1933 па 1939 год камандаваў Г.К. Жукаў. У 1942-1943 гадах на тэрыторыі сядзібы размяшчалася гета, усе вязні якога былі расстраляныя.

**12. Палац 2-й паловы XVIII стагоддзя**, помнік архітэктуры ранняга класіцызму. Ён быў пабудаваны ў другой палове XVIII стагоддзя і належаў Мержеевского.

Гасцяваў у нашых месцах Напалеон Орда. Менавіта ён захаваў сядзібу з параднага боку, паказаўшы ў рамантычных часах не толькі палац на ўзвышшы, але і малыя архітэктурныя формы. Дзякуючы пэндзля знакамітага мастака мы сёння маем магчымасць бачыць і ўяўляць, якім быў раней старадаўні палац.

**13. Вёска Гразавок. Сядзібны дом-спадчына роду Мержэеўскіх**. Аднапавярховы дом у класічным стылі сёння цалкам закінуты. З паўднёвага боку знаходзіцца некалькі гаспадарчых пабудоў. На пад'ездзе да вёскі захаваліся руіны флігеля, які нагадвае млын.

ГРАМАДСТВА 13 снежня 2014 г. МІНСКАЯ ПРАЎДА 3

Слова клікала ў бой

# ДАРОГАМІ ПАМЯЦІ

**Другі этап сумеснай акцыі «Слова клікала ў бой» , арганізаванай абласной структурай Беларускага саюза журналістаў, абласным адзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, газетамі «Мінская праўда» і «Звязда» , прайшоў на Капыльшчыне. Госці пабывалі ў школьным музеі Яна Скрыгана Каменскага вучэбна-педагагічнага комплексу «Дзіцячы сад — школа» , у музеі Адама Русака Песачанскай сярэдняй школы імя Сцяпана Умрэйкі, у музейным пакоі Адама Русака мясцовага цэнтра культуры і адпачынку. А ў Капылі адбылася сустрэча з чытачамі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Анатоля Астрэйкі, дзе ішла размова пра творчую спадчыну вядомых майстроў слова рэгіёна, пра кнігі, якія сёння прапаноўваюць бібліятэкары сваім чытачам, і тыя навінкі, што з'явяцца неўзабаве на кніжных паліцах.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА

У школьным музеі Каменскага вучэбна-педагагічнага комплексу «Дзіцячы сад — школа»

Святлана ХОРСУН

## Любімыя рэчы

У школьным гісторыка-краязнаўчым музеі «Бацькаўшчына» Каменскага вучэбна-педагагічнага комплексу «Дзіцячы сад — школа» добра ведаюць не толькі біяграфію паэта, навеліста, публіцыста і крытыка Яна Скрыгана, а і тыя любімыя рэчы, якія захоўваюцца ў музеі і якія былі вельмі дарагімі для слыннага земляка. Гэта фотаздымкі «З першай жонкай», «На этапе» — аб трагічным часе, калі літаратар быў пазбаўлены волі на 10 год за нібыта контррэвалюцыйную дзейнасць і напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны сасланы ў Сібір. Быў вызвалены Ян Скрыган толькі ў 1946 годзе, але пазбаўлены грамадзянскіх правоў яшчэ на пяць год. Ад першага шлюбу ў яго нарадзіўся сын Усевалад, але пры жыцці ім не давялося сустрэцца: у гады вайны ён з маці быў вывезены ў Германію, дзе жыве і сёння... Пра гэтую трагічную старонку яго жыцця расказала гасцям дырэктар музея Ірына Тагіль.

Трэці дарагі сэрцу пісьменніка фотаздымак — «Пільнае вока» — апавядае пра той адрэзак жыцця, калі Яна Скрыгана як выдатнага знаўцу беларускай мовы запрасілі працаваць у сталічнае выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя». У ліку любімых рэчаў вядомага земляка — яго двухтомнік «Кругі», а таксама шахматы і кіёчкі, якія ён майстраваў сам. У школьным краязнаўчым музеі ёсць і іншыя асабістыя рэчы: акуляры, станок для галення, стол, камізэлька, стул, настольная лямпа і будзільнік, які Ян Скрыган браў з сабой у камандзіроўкі. Некаторыя з экспанатаў перадала сюды часты госць школы дачка пісьменніка Галіна. Родныя Яна Скрыгана прывезлі ў музей і новую кнігу — дзённікавыя запісы «Сэрцу горкая далячынь».

Вывучаючы яго творы, юныя следапыты вядуць значную даследчыцкую работу. Школьным музеем за год зроблена ўжо многае. Тут праходзяць не толькі экскурсіі, але і ўрокі, выставы. Дарэчы, паводле слоў кіраўніка Каменскага вучэбна-педагагічнага комплексу Галіны Васілевіч, праводзіцца значная работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. У музеі ёсць і свой рарытэт — газета «Правда» за 10 мая 1945 года. Юныя следапыты працягваюць пошук невядомых герояў Вялікай Айчыннай вайны. Не так даўно было ўстаноўлена яшчэ 14 імёнаў тых, хто пахаваны ў брацкай магіле.

## Жывіце багата

«Усё было мне міла тут...». Вершаваныя радкі таленавітага паэта Капыльшчыны Анатоля Астрэйкі можна, бадай, аднесці да кожнага, хто нарадзіўся ў Пясочным — найпрыгажэйшай мясціне Капыльшчыны. У XVI стагоддзі гэтая мясцовасць уваходзіла ў Слуцкае княства. У свой час князь Юрый Алелькавіч заснаваў тут мястэчка. Непадалёк жыў і вядомы ў тагачаснай Еўропе вучоны, фізік, этнограф, астраном, метэаролаг і саветнік царскага двара Якуб Наркевіч-Ёдка, якому на міжнародным кангрэсе ў Францыі, адзінаму ў Еўропе, было прысвоена ганаровае званне «Прафесар электраграфіі і магнетызму». Яго маёнтак быў узведзены на беразе Нёмана. Побач размясціліся млын, вінзавод і вежа, дзе Наркевіч-Ёдка праводзіў доследы. Тут упершыню ў Еўропе быў пабудаваны і першы санаторый, дзе лячылі людзей электратэрапіяй, сонечнымі і гразевымі ваннамі. І дагэтуль той лес у Пясочным называюць Дачамі... Пра ўсё гэта можна пачуць ад юных экскурсаводаў школьнага краязнаўчага музея, якія ганарацца гісторыяй краю і сваімі землякамі.

Памятаюць тут мясцовага настаўніка — выкладчыка беларускай мовы і літаратуры Івана Шаблюка, у якога ў свой час вучыліся вядомыя паэты Анатоль Астрэйка, Адам Русак, вучоны Сцяпан Умрэйка (яго імя сёння носіць Песачанская школа) — з яго дапамогай тут былі ўзведзены мост цераз Нёман, школьны будынак і Дом культуры. Іх агульны фотаздымак беражліва захоўваюць у школьным музеі. Калі пачалася вайна, мужчыны пайшлі ваяваць з ворагам. Многія дапамагалі партызанам. Пясочнае называлі «партызанскай Масквой». Пазней Анатоль Астрэйка напіша: «Ад бітваў крывавых і слаўных паходаў мае землякі не былі ў старане...». Першай настаўніцай знакамітага паэта была яго цётка Параска, што хадзіла па хатах і вучыла дзяцей. Пісалі на кардонках і шпалерах, а кнігі замяняла памяць настаўніцы. З прыходам Савецкай улады ў Пясочным з'явілася свая школа, дзе выкладаў родны дзядзька паэта Іван Іванавіч Шаблюк. Свой першы верш Анатоль Астрэйка напісаў у 15 год. Яго творы сведчылі аб тым, што ў беларускай старонцы з'явіўся свой Ясенін.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, паэт таленавіта пісаў і сатыру: у 1943 годзе Анатоль Астрэйка працаваў сакратаром газеты «Раздавім фашысцкую гадзіну». Ён адчайна помсціў сваім вострым пяром за разбураныя вёскі і гарады, за забітых сваіх землякоў. Фашысты не раз учынялі расправы над мірнымі жыхарамі, высочвалі партызан, а 5 студзеня 1943 года ў Пясочнае прыехалі карнікі. Яны сагналі людзей у будынак былой школы і пачалі расстрэльваць тых, сваякі якіх былі ў партызанах. Былі забіты 43 чалавекі — 30 дарослых і 13 дзяцей. А ў 1944 годзе вёску бамбілі...

Насупраць школы — брацкія могілкі, дзе пахаваны 12 партызан брыгад імя Варашылава і імя Чапаева і чырвонаармеец. У 1956 годзе тут устаноўлены помнік усім загінулым «Смуткуючая маці». На мемарыяльных плітах — імёны 182 загінулых на фронце і на акупаванай тэрыторыі. «Іх на плошчы сяла пахавалі. На магілах вяргіні растуць. І калышуцца Нёмана хвалі. Пра іх славу удалеч нясуць», — напісаў у сваім вершы Адам Русак, які нарадзіўся тут у маі 1904 года. У 1925 годзе ён паступіў у музычны тэхнікум па класу валторны, потым вучыўся ў Ленінградскай кансерваторыі. Прыязджаў на вёску да бацькоў. А ў адным з лістоў да маці, Марыі Ігнатаўны, і нарадзіліся вядомыя радкі папулярнай песні: «Бывайце здаровы, жывіце багата». Першымі яе выканаўцамі былі маці ды іншыя аднавяскоўцы Адама Русака. Паэт быў вельмі сціплым чалавекам, і многія яго вершы адносіла ў рэдакцыі жонка Марыя Яўгенаўна. Яму штогод прапаноўвалі пуцёўкі на Чорнае мора, на што ў яго быў адзін адказ: «Навошта нам тое мора? Нам лепш у вёску — па грыбы». Напрыканцы жыцця жыў у Пясочным, дзе і пахаваны. Калі тут з'явілася новая вуліца, яе назвалі імем славутага земляка — Адама Русака.

## Сэрцу дарагія

У Капыльскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Анатоля Астрэйкі было людна: адразу відаць — тут шмат людзей любяць кнігу і шануюць сваю духоўную спадчыну. Яны прыйшлі на сустрэчу з пісьменнікамі і журналістамі. «Сімвалічна, што наша сумесная акцыя «Слова клікала ў бой» праходзіць паміж дзвюма святымі датамі — 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзем Вялікай Перамогі, — адзначыў у сваім выступленні галоўны рэдактар газеты «Мінская праўда», старшыня Мінскай абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў Мікалай Літвінаў. — У час гэтай акцыі мы вырашылі ўзгадаць пра тых людзей, якія прынеслі славу гэтай зямлі і якія змагаліся за яе не толькі зброяй, але і словам. Імёны іх дарагія сэрцу кожнага беларуса. Мяркую, што такія сустрэчы вельмі важныя для кожнага з нас».

Дырэктар Капыльскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Анатоля Астрэйкі Таццяна Серая ўзгадала тых славутых землякоў, якімі ганарацца не толькі на Капыльшчыне. «Іх больш за паўсотні, сярод іх — Цішка Гартны, Алесь Гурло, Мікола Хведаровіч, Ян Скрыган, Сцяпан Александровіч, Анатоль Астрэйка, Кузьма Чорны і многія іншыя, — адзначыла яна. — Нам вельмі дарагая спадчына нашых землякоў, мы цэнім кожнае напісанае імі слова». Вельмі сімвалічна прагучалі і паэтычныя радкі-наказ паэта Сцяпана Александровіча сваім землякам: «Каб не ляжала анямелай цаліна. Каб хлеб не пераводзіўся ў засеках. Каб слова тройчы клятае «вайна» і знаць не знала мова чалавека». Намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда», член саюзаў пісьменнікаў Беларусі і Расіі Алена Стэльмах у сваім выступленні акцэнтавала ўвагу на выданнях антываеннай тэматыкі. З дапамогай выдавецтва штогод выходзіць больш за сотню самых розных кніг. У апошні час пабачылі свет дзве кнігі, прысвечаныя Першай сусветнай вайне. Вядомы беларускі пісьменнік, літаратуразнаўца і крытык Алесь Марціновіч, што прыехаў сюды ў складзе творчага дэсанта, пэўны час жыў на гэтай багатай талентамі зямлі. Яго кнігі — таксама на паліцах Капыльскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Анатоля Астрэйкі. Тут ведаюць і Алеся Марціновіча, і тыя літаратурныя працы, што выходзяць з-пад яго нястомнага пяра. У час сустрэчы з чытачамі ішла прынцыповая і шчырая размова пра якасць зместу і афармлення сучасных кніг, якія тут шчыра шануюць, як і памяць пра сваіх таленавітых землякоў.



Бібліятэкар Капыльскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Анатоля Астрэйкі Святлана Кахановіч: «Нашы фонды папаўняюцца кнігамі беларускіх пісьменнікаў»



Помнік землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у аграгарадку Пясочнае

# 2021

январь

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

февраль

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |

март

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

апрель

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

май

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

июнь

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

июль

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

август

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

сентябрь

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

октябрь

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

ноябрь

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | | | | | |

декабрь

| п | в | с | ч | п | с | в |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

# Для запісу кантактаў

Сардэчна запрашаем!

# Для запісаў

# Гістарычны музей «Бацькаўшчына»

Час работы:

Па будняях **с 9.00 до 16.00**.
У выхадныя дні **па папярэднім запісе**.
Тэлэфон: **8-017-19-49-2-38**.

Уваход у музей бясплатны.




223914, Капыльскі раен,
аг. Камень, вул. Школьная, 155а.

8-017-19-49-2-17.

kamen-school@tut.by.

https://kamen.schools.by/